# УДАР ПА ВОРАГУ З ФРОНТА ДАПОЎНІМ ПАРТЫЗАНСКІМІ ЎДАРАМІ З ТЫЛА

## Прамова Васіля КАЗЛОВА

### ГЕРОЙ СОВЕЦКАГА САЮЗА, КАМАНДЗІР ГРУПЫ БЕЛАРУСКІХ ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ

За час вайны партызаны Беларусі ў жорсткіх баях знішчылі многа дзесяткаў тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў, у тым ліку 13 генералаў, пусцілі пад адкос некалькі сот воінскіх эшалонаў, узарвалі на чыгунках і шасэйных дарогах больш 900 мастоў, збілі і знішчылі на аэрадромах 205 самалётаў, падбілі і спалілі 259 танкаў, захапілі і знішчылі 19 штабаў воінскіх часцей і падраздзяленняў.

У жорсткай свяшчэннай барацьбе выраслі і загартаваліся многія тысячы бясстрашных народных мсціўцаў. 1.286 партызан Беларусі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза. Беларускі народ жыве адной думкай, адным жаданнем—помсціць ворагу, знішчаць яго ўсцяж і ўсюды, удзень і ўночы.

Браты славяне!

Чырвоная Армія граміць гітлераўцаў на велізарным совецка-германскім фронце. Нашы саюзнікі б'юць ненавіснага ворага ў Афрыцы, бамбяць ваенныя і прамысловыя аб'екты праціўніка, прадвяшчаючы адкрыццё другога фронта ў Еўропе.



Мы, партызаны, павінны дапоўніць гэтыя ўдары па ворагу моцнымі ўдарамі з тыла. Будзем біць і граміць азвярэлыя полчышчы ворага да канчатковага іх разгрому, да поўнага вызвалення ўсіх славянскіх земляў ад фашысцкіх крывавых разбойнікаў. **(Апладысменты).**

---

*) Прамовы друкуюцца па скарочанай стэнаграме.